# І ГЭТА НЕПАРУШНЫ ПРЫНЦЫП»


Фота БелТА.

для перапрацоўкі алейных культур. Прадукцыя пастаўляецца ў Расійскую Федэрацыю і на знешнія рынкі, дзе карыстаецца попытам. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што прыватным кампаніям таксама вельмі важна не гнацца за імпартнымі камплектуючымі і дэталямі, а найперш купляць сваё. Гэта задача ў тым ліку і для Мінпрама. «Калі патрэбна будзе дапамога, вы гаварыце. Для нас важна, каб вы развіваліся», — сказаў кіраўнік дзяржавы кіраўніку «Глобалхарчсэрвісу» Сяргею Сільчанку.

Сусед гэтага прадпрыемства (вытворчасці размяшчаюцца ў адным цэху) — «СтратНанаТэкІнвест». Гэтая арганізацыя займаецца распрацоўкай тэхналогій танкаплёначных пакрыццяў і вытворчасцю вакуумнага тэхналагічнага абсталявання для нанясення такіх пакрыццяў. Новы кірунак — апрацоўка дэталяў для машынабудавання. 100 % прадукцыі — інавацыйная. На прадпрыемстве працуе 55 чалавек. Прэзідэнт спытаў у генеральнага дырэктара Айрата Хісамава, ці плануюць яны пашырацца. Той адказаў, што такія планы ёсць.

Паглядзеў кіраўнік дзяржавы і як працуе прадпрыемства «ЕўраСтройСтандарт». Асноўны кірунак яго дзейнасці — праектаванне лёгкіх стальных тонкасценных канструкцый. Тут Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў пільную ўвагу на лакалізацыю. Прадукцыя гэтага прадпрыемства запатрабавана ў будаўніцтве аб'ектаў аховы здароўя, сельскай гаспадарцы, прамысловасці, гандлі і іншых сферах, дзе патрэбны камфортныя, зручныя будынкі.

Аляксандр Лукашэнка завітаў і ў цэхі ўласна Мотавелазавода. Ён прайшоў праз цэхі фарбы, зборкі і рамакамплектаў. Дзякуючы рашэнням Прэзідэнта, вытворчасць на знакамітым прадпрыемстве атрымала другое дыханне. Шмат чаго зроблена для пашырэння асартыменту і лакалізацыі прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы актыўна цікавіўся работай вытворчасці. І не толькі дакладамі кіраўніцтва, але і меркаваннямі рабочых, на звычайны ход працоўнага дня якіх візіт Прэзідэнта аніяк не паўплываў. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, тут працуюць зусім маладыя людзі. Дырэктар Мотавела ўдакладніў, што сярэдні ўзрост работнікаў — 41 год, расказаў пра тое, што ўсім іншагароднім даецца інтэрнат. «Усіх трэба перавесці на арэнднае жыллё», — такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў кіраўніку завода. Аляксандр Лукашэнка зайшоў і ў памяшканне, дзе работнікі могуць адпачыць і падсілкавацца. Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў паведаміў, што ў Мінскім гарадскім тэхнапарку ў хуткім часе з'явіцца сталовая. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што вакол тэхнапарка фарміруецца сацыяльная сфера, куды адносяцца інтэрнаты, арэнднае жыллё. Ён зрабіў акцэнт на тым, што цэны на гэта павінны быць даступныя. «Да людзей трэба ставіцца добра», — такое агульнае патрабаванне беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка, запускаючы вытворчасць нейкай прадукцыі, трэба задаваць пытанне — ці сапраўды гэта трэба? Прэзідэнт упэўнены, што дбаць аб рэалізацыі прадукцыі павінна найперш само прадпрыемства.

### «Ім не сцерці подзвіг нашага народа»

У Прэзідэнта спыталі яго меркаванне аб тым, што ў Кіеве каля манумента «Радзіма-маці» на Алеі гарадоў-герояў дэманціравалі надпісы «Мінск» і «Масква», а таксама пяціканцовыя зоркі гарадоў-герояў. «Калі б вы не сказалі, я нават і не ведаў, — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка. — Калі ім зручна — няхай сціраюць. Ім не сцерці подзвіг нашага народа». Па яго словах, у Беларусі ў 1990-я таксама былі падобныя тэндэнцыі. Але наша краіна такім шляхам не пайшла. І ў гэтым выйграла. Беларускі лідар адзначыў, што даўно ведае прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага. «Мне здавалася, што гэта нармальны, разумны чалавек. Але бачыце, як паступіў. Вось і атрымалася», — сказаў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, усё, што адбылося ва Украіне, — ад улады: «Усё пачыналася адтуль, цябе падштурхоўвалі да гэтага. Ну чаму ты не падумаў, што гэта шкодна для твайго народа? Ну іншыя былі інтарэсы. Гэта іх справа».

### «Вы ўжо не будзеце крычаць, што мы «лапатнікі»

У працяг тэмы гістарычнай памяці згадалі выстаўку дасягненняў суверэннай Беларусі «Мая Беларусь», якая разгарнулася ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. У Прэзідэнта спыталі, ці будзе працяг у гэтага праекта. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дадзеная экспазіцыя — гэта яшчэ не поўны выставачны праект. Поўнасцю ён будзе адкрыты вясной, да Дня Перамогі. Ідэя была ў тым, каб адкрыць першы этап праекта, паказаць яго людзям. Асабліва, па словах беларускага лідара, важна, каб выстаўку ўбачылі дзеці і моладзь.

«Мы будзем развіваць гэты сектар — выставачны, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Добра, што вы гэта ўбачылі. Вы ўжо не будзеце крычаць, што мы «лапатнікі». Вы будзеце разумець, што і вось гэта мы можам зрабіць сваімі рукамі. У гэтым была задума».

Выставачная дзейнасць, якая адлюстроўвае гісторыю і дасягненні Беларусі, працягнецца і ў Нацыянальным гістарычным музеі, які будзе пабудаваны каля Палаца Незалежнасці. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вельмі важна, каб моладзь бачыла, адкуль наша краіна пайшла. І падаваць гэтую інфармацыю трэба ярка, незвычайна, па аналогіі з выстаўкай «Мая Беларусь», якая карыстаецца вялікай папулярнасцю. «Гэта будзе маштабны музей, дзе вы ўбачыце, што вакол нас нічога не было, акрамя лясоў. Нашы людзі сваю дзяржаўнасць пачалі развіваць тут. Тураўскае, Полацкае княствы... Вось мы пакажам, што мы не «лапатнікі», што мы не Іваны, якія не помняць роду свайго, што мы — людзі з глыбокай гісторыяй», — падкрэсліў Прэзідэнт. Па яго словах, галоўная мэта гэтага праекта — зрабіць так, каб кожны наведвальнік экспазіцыі ганарыўся тым, што жыве ў гэтай краіне.

## «ТРЭБА РАЗВІВАЦЦА, ЗМАГАЦЦА»

**Магчымасць задаць пытанні кіраўніку дзяржавы не ўпусцілі і журналісты. І першае пытанне, канешне, пра электаральную кампанію. Журналісты заўважылі, што Аляксандр Лукашэнка не выступае праграмна, не ўдзельнічае ў дэбатах, а працуе ў звыклым рэжыме. А кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што нават не сочыць за ходам выбарчай кампаніі — няма часу.**

«Ведаю, што ідуць дэбаты. Але ніводных дэбатаў я не бачыў. Цяпер не да дэбатаў. Ды і што дэбаты — каб людзі разабраліся. Разбірайцеся. Сёння не словы патрэбны. Сёння патрэбны справы. І Беларусь ніколі не будзе Беларуссю 1990-х гадоў, калі мяне маладога выбіралі Прэзідэнтам. Тады мы не маглі марыць аб гэтых «палацах» — аб вытворчасці і іншым. Тады трэба было выжываць. А цяпер трэба развівацца, змагацца, таму не словы патрэбны, а справы», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён праанансаваў хуткае адкрыццё новай вытворчасці аўтобусаў. «Попыт каласальны на нашы аўтобусы. Мы пабудавалі за паўтара-два гады гэты завод. Таму патрэбны справы. Я гэта ведаю больш, чым хто-небудзь. Таму працягваю займацца сваімі справамі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што ў яго шмат «запазычанасцяў» у выглядзе мерапрыемстваў, прысвечаных вытворчай тэматыцы. А наступіць вясна, і трэба будзе займацца сельскай гаспадаркай.

> **«Хлеб трэба будзе сеяць. Нікуды мы не дзенемся. З гэтым Прэзідэнтам, з другім — вам хлеб давядзецца сеяць. Таму што без хлеба нікуды», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.**

Прэзідэнт адзначыў, што электаральная кампанія ў краіне праходзіць спакойна і гэта нармальна. Шоу нам не патрэбна. Аляксандр Лукашэнка заклікаў усіх грамадзян вызначыцца і ў дзень выбараў аддаць свой голас за кандыдата, які найбольш ім імпануе. Тым больш што часу для гэтага дастаткова, з 21 студзеня пачынаецца датэрміновае галасаванне. «Вы людзі вопытныя, разумныя. Думайце. Я нікалі не казаў пра выбары, не заклікаў вас да чагосьці. Прыйдзіце прагаласуйце — цэлы тыдзень. Знойдзеце час — прагаласуйце. Ну, не захочаце — мы ж вас на вяроўцы цягнуць не будзем», — дадаў беларускі лідар.

Журналісты заўважылі, што польскія ўлады актыўна рэагуюць на выбары ў Беларусі — ужо назвалі гэтую кампанію махлярствам, адмаўляюцца адкрываць пункты пропуску, бо яны не бачаць крокаў ад беларусаў, і ўсюды прыцягваецца тэма Пачобута. У Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся, чаму палякам няймецца. «Што датычыцца Пачобута, нават казаць няма чаго. Я вам шчыра гавару як чалавек, які інфармаваны: яны адмовіліся ад Пачобута. Палякі адмовіліся весці нават размовы па Пачобуту. Наколькі мяне інфармуюць, Пачобут не хоча туды ехаць. Вось і ўсё пытанне, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Анджэй Пачобут — беларускі грамадзянін, і за ўчыненыя злачынствы ён адказаў па законе. Далей будзем глядзець. Паверце, на Пачобуце свет не сышоўся».

Што датычыцца пунктаў пропуску, то, па словах кіраўніка дзяржавы, палякі могуць хоць усе закрыць, беларусы туды не ездзяць, нічога не возяць. «Што, Мотавелазавод возіць туды прадаваць прадукцыю? Не. Яны ж санкцыі супраць нас увялі. Увялі — добра. Ну, мы і не змагаемся супраць той міграцыі і людзей, якія там хочуць жыць і якія туды ідуць. Я ўжо тысячу разоў пра гэта казаў: з пятлёй на шыі я не буду іх абараняць», — адзначыў Прэзідэнт.

Каментуючы заявы аб «махлярстве», Аляксандр Лукашэнка параіў польскім уладам разабрацца з сітуацыяй у сваёй краіне. Ён звярнуў увагу, што ў мае прэзідэнцкія выбары ў Польшчы, вось улады і спрабуюць пераключыць увагу на Беларусь, каб не адказваць перад сваім народам.

Прэзідэнт падкрэсліў, што збеглыя працягваюць абмяркоўваць планы ўзброенага нападу на Беларусь з тэрыторыі Украіны або Польшчы. «Ды калі ласка, паспрабуйце. Потым не крыўдуйце. Мы бачым, што яны рыхтуюць там атрады і іншае. Даўно бачым. Але яны няхай не думаюць, што гэтыя атрады супраць Беларусі будуць ваяваць. Яны на тэрыторыі Польшчы, і зброю яны яшчэ могуць выкарыстаць супраць палякаў.

> **«Літоўцы «наеліся» беларусаў: там жа нацыяналісты нашы прыехалі (дзякуй ім) і пачалі разважаць, што Вільня і іншае — гэта беларускія гарады».**

Палякі ўжо не ведаюць, што з нашымі збеглымі «літоўцамі» рабіць», — сказаў ён.

«Жыццё ідзе, развіваецца. Нам не трэба асабліва перажываць за палякаў і за ўсё, што ў іх адбываецца. Гэта звычайная балбатня. Гэта скокі пад амерыканцаў. Амерыканцы цяпер, каб знішчыць Еўропу (а гэта іх мэта, пры Трампе, паглядзіце, гэта ўзмоцніцца), выкарыстоўваюць палякаў. Будзе як з Украінай. Не дай бог, канешне», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

### «Гэта — роднае дзіця»

На памяць аб наведванні Мінскага гарадскога тэхнапарка і ў знак падзякі за клопат аб Мотавелазаводзе Прэзідэнту падарылі матацыкл маркі «Мінск Д4 125». Гэта першы матацыкл, выраблены на новых мадэрнізаваных лініях прадпрыемства.

«Усе падарункі аддаю дзяржаве, але матацыкл не аддам. Прынамсі да вясны. Вясной сфатаграфуюся спецыяльна, «Пул Першага» выкладзе гэта ўсё. ...Беларускі матацыкл. Хоць у мяне ёсць і іншыя матацыклы, але гэты — роднае дзіця, таму я вам вельмі ўдзячны», — з гумарам падзякаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**